**Адкрывае нашу новую рубрыку вядучы бібліятэкар адзела захоўвання спецыялізаваных фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Святлана Мілейка.**

# БІБЛІЯТЭКАР У ЖЫЦЦІ І Ў КІНО

ЮЛІЯ РАМАНЬКОВА

Сваю справу Святлана Мілейка вельмі любіць. І сама з задавальненнем вывучае розныя дакументы, газеты, кнігі, бо цікавіцца гісторыяй, асабліва ваеннай тэматыкай. А яшчэ мае не зусім звычайнае хобі – здымаецца ў кіно.

## ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ

Святлана нарадзілася ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці. З дзяцінства любіла чытаць. Асабліва цікавілася кнігамі пра жывёл і расліны. Такое захапленне і вызначыла ў далейшым выбар прафесіі. У 2012 годзе яна скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Пасля вучобы адразу трапіла ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, дзе працуе ўжо адзінаццаць гадоў.

– *Як прыйшла сюды, так і застаюся ў любімым сектары газетнага фонду. Штодзень праглядаю новыя нумары газет, якімі больш за ўсё цікавяцца нашы чытачы. Выконваю абавязкі па захаванасці фонду, падбіраю экзэмпляры для падшывак, займаюся іх творчым афармленнем*, – расказвае пра некаторыя свае абавязкі Святлана.

«Прататыпам» для фотастылізацыі паслужыла гераіня вокладкі No 9 «Работніцы і сялянкі» за 1986 год – галоўны бібліятэкар чытальнай залы Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі Роза Сомава.






Прафесія бібліятэкара – гэта не толькі штодзённая карпатлівая праца з фондамі, але і захапляльныя падарожжы, сустрэчы з цікавымі людзьмі і новыя ўражанні. Напрыклад, летам Святлана прымала ўдзел у міжнародным праекце «Адукацыйная калабарацыя бібліятэк Садружнасці», які праходзіў у Маскве.

– *Мы наведалі розныя бібліятэкі: Расійскую дзяржаўную, дзіцячую, бібліятэку-чытальню імя І. С. Тургенева. Больш за ўсё мяне ўразіла бібліятэка імя Ганны Ахматавай: вельмі сучасная! Там ёсць апарат электроннай выдачы кніг: можна прасканаваць штрыхкод, свой чытацкі білет і забраць кнігу дадому, а потым вярнуць такім жа спосабам. Ёсць і кіназала з вялікім экранам, прафесійна абсталяваная студыя гуказапісу. Акрамя бібліятэк, наведалі славутыя мясціны расійскай сталіцы. Ужо чакаю наступных праектаў*, – успамінае сваю вандроўку бібліятэкар.



Праца ёй вельмі падабаецца, у першую чаргу з-за магчымасці мець доступ да шырокага кола інфармацыі. Святлана першай прымае газеты Беларусі і з усяго свету. І ў кожным выданні знаходзіць штосьці цікавае і карыснае для сябе.

*– Я пастаянна вучуся, удасканальваю свае навыкі. У бібліятэцы можна вывучаць гісторыю па рэальных дакументах: часопісах, кнігах і газетах. У нас ёсць выданні нават 1880-х гадоў. Залаты газетны фонд – рэвалюцыйнага, даваеннага, ваеннага перыядаў – складае 65% ад усіх газет, якія захоўваем,* – з захапленнем расказвае мая суразмоўніца.




## ЗНЯЦЦА Ў КІНО

Святлана любіць вырошчваць кветкі, асабліва фіялкі. Па словах суразмоўніцы, яе кватэра з-за раслін падобная на сапраўдныя трапічныя джунглі. Вяжа кручком: занятак гэты супакойвае і расслабляе.

Ёсць у Святланы яшчэ адно незвычайнае і вельмі творчае хобі – яна здымаецца ў кіно.

*– Адна з апошніх роляў якраз была звязаная з бібліятэчнай справай, так што ў мяне цудоўна атрымалася ўжыцца ў вобраз,* – пасміхаецца яна. – *У асноўным здымаюся ў расійскіх фільмах, аднойчы – ва ўзбекскім. Сярод іх – серыял «Прошу поверить мне на слово», ваенныя фільмы «Про Петра и Павла», «Узбечка» і інш. Апошні фільм, у якім здымалася – «Спасение капитана Максимова». Вельмі цікавы быў праект тэлеканала «Звезда» – дакументальны серыял «Москва фронту». Там я была актрысай масавых сцэн.*

Па фільмах, дакументах і кнігах Святлана вывучае гісторыю, асабліва ж цікавіцца ваеннай тэматыкай. Кажа, жаночыя раманы, дэтэктывы не для яе!

*– Дзякуючы здымкам у ваенных фільмах я спазнаю шмат новага, а потым яшчэ дадаткова паглыбляюся ў тэму, чытаю, шукаю матэрыялы. Дарэчы, паводле апошняй ролі – я іграла бібліятэкара – мне трэба было перадаць галоўнаму герою кнігу на подпіс. Не ўяўляеце, як хацелася прачытаць яе самой!* – дзеліцца мая суразмоўніца.

## ЯК ЖА БІБЛІЯТЭКАР ТРАПІЛА Ў СВЕТ КІНО?

*– Яшчэ ў студэнцтве сябры аднойчы паклікалі з сабой на здымкі праекта «Звёздный ринг». Мне вельмі спадабалася: там была жывая музыка, спевы,* – успамінае Святлана. *–Так стала ўдзельнічаць спачатку ў музычных праектах, а потым і ў кіно.*

## ПАЖАДАННІ «АЛЕСІ»

*– Мая мама працавала паштальёнам у горадзе Глыбокае, таму добра ведала і з задавальненнем чытала «Алесю». Зараз яна з нецярпеннем чакае гэтай публікацыі. Са свайго боку, пажадаю здароўя і прыгажосці чытачкам часопіса і ўсім беларускім жанчынам. «Алесі» – вялікіх тыражоў і цікавых інтэрв'ю!*